Ганна САВІЧ

**Прыход вясны**

Здаецца, і не было зімы.
Паміж праталін хутка
Знікла,
На голых дрэвах
Прамяні
Звісаюць на галінках
Ніткай.
Наўколле дыхае
Вясной,
І хмель у водары
Паветра,
Галінка кожная
Зпрасонь
Заварушылася
Ўрэшце.
Апанаваўся вясной свет,
Ручай спяшаецца
Вясёлы,
І сам не ведае яшчэ
Куды, – ці ў рэчкі,
ці ў азёры.
Вясна аблічча аснуе,
Напэўна, з радасці,
Усмешак,
З таго, што так усім
Не стае,
І з ладу ва ўсім божым
Свеце.
І мяне бадзёрасць
узяла,
іду, шчаслівая, скрозь
ветрык
на той акраечак
сяла,
калісь вясну там стрэла
першую.

